**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# РАЖКОЎ ЯЎГЕН НАЗАРАВІЧ

**МАСТАК**

**16 ЛІПЕНЯ 1920 Г. – 24 КРАСАВІКА 2009 Г.**

**ФОНД № 496**

**ВОПІС № 1**

**1938 – 2011 гг.**

**МІНСК 2023**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 496**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Н. РАЖКОВА | 1-7 | 1 |
| 2. | ФАТАГРАФІІ ТВОРЧЫХ РАБОТ Я.Н. РАЖКОВА | 8-19 | 1-3 |
| 3. | ПЕРАПІСКА Я.Н. РАЖКОВА | 20-29 | 3-4 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.Н. РАЖКОВА | 30-48 | 4-6 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Я.Н. РАЖКОВА | 49-54 | 6 |
| 6. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Н. РАЖКОВА | 55-65 | 6-7 |

## Прадмова

**Ражкоў Яўген Назаравіч** нарадзіўся 16 ліпеня 1920 г. у г. Рагачове Гомельскай вобласці ў сям'і Назара Мітрафанавіча і Марыі Захараўны Ражковых. У 1934–1939 гг. вучыўся ў Ленінградскім мастацкім вучылішчы.[1]Быў прызваны ў Чырвоную армію ў верасні 1940 г. Служыў у г. Львове у 53 танкавым палку, дзе і застала яго вайна. У час Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у баявых дзеяннях на Паўднёва-Заходнім і 3-м Беларускім франтах (1941–1945 гг.). Быў тройчы паранены, звольнены ў запас па інваліднасці ў 1945 г. З гэтага часу мастак стала пражываў у Мінску. Працаваў дырэктарам лабараторыі "Народныя промыслы" (1945–1947 гг.), а таксама мастаком першай катэгорыі ў Цэнтральных мастацкіх майстэрнях пры Саюзе мастакоў БССР (з 1967 г. Мінскі мастацка-вытворчы камбінат) з 1945 г. па 1993 г. Прымаў удзел у мастацкіх выстаўках (1949–2008 гг.). У 2000 г. і 2002 г. прайшлі дзве персанальныя выстаўкі Я.Н. Ражкова. У 2002 г. быў выдадзены альбом-каталог "Яўген Ражкоў. Іканапіс. Жывапіс". Сябра Саюза мастакоў Беларусі з 1998 г. (зараз Беларускі саюз мастакоў).

Я.Н. Ражкоў узнагароджаны ганаровымі граматамі Саюза мастакоў СССР (1967), Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1990, 2000), медалямі за доблесную працу да 100-годдзя У.І. Леніна, "Ветэран працы" (1980), за заслугі ў выяўленчым мастацтве (2000), ганаровым знакам Прэзідэнта за асабісты ўклад у развіццё культуры Рэспублікі Беларусь (2003). Ваенныя ўзнагароды: ордэн Славы III ступені (1944), ордэн Чырвонай Зоркі (1945), медаль "За перамогу над Германіяй" (1945), ордэн Айчыннай вайны I ступені (1983), юбілейныя медалі, медаль Г.К. Жукава.

Аўтар тэматычных карцін "Від на элеватар" (1947), "Прыезд агранома ў калгас" (1951), "Збожжа паспела" (1953), "Рыбалка на возеры Сялява" (1954, 1961), "Рыбакі" (1960); пейзажаў "Дарога на маёўку" (1946), "Зімняя раніца ў Мар'інай Горцы" (1947), "Сплаўная прыстань" (1948), "Зімка" (1951), "Жыта" (1954), "Гагры" (1955), "Ашэ" (1956), "Геленджык" (1956), "Бярозкі" (1957), "Сакавік" (1957), "Зіма ў парку Чалюскінцаў" (1957), "Мосцік" (1961), "Беларуская зіма" (1965), "Ранак" (1965), "Вярхоўе ракі Бярэзіны" (1971), "Азяранскі луг" (1976), "Пачатак вясны" (1976), "Залатая восень" (1977), "Квітнеючы сад" (1991), "Восень" (1994), "Прыцемак" (1995), "Ціхі дзень" (1995), "Зімовы вечар" (1997), "Першая адліга" (2000); партрэтаў "Наталія" (1976), "С.І. Се́ліханаў" (1976), "Сафія" (1984), "Генерал І.П. Дуднік" (1981), "Неаніла" (2000), "Мая матуля" (2002), аўтапартрэтаў і інш. Па заказах мастацка-вытворчага камбіната пісаў партрэты ваенных, партыйных, дзяржаўных кіраўнікоў, дзеячаў навукі, культуры, перадавікоў вытворчасці і інш. Пачынаючы з 1989 г. напісаў больш за 600 ікон "Святая княгіня Вольга" (1989), "Гасподзь Уседзяржыцель" (1990), "Неапалімая Купіна" (1991), "Дзяржаўная" (1993), "Уседзяржыцель у Славе" (1993), "Нерукатворны вобраз Збавіцеля на Убрусе" (1993), "Свяціцель Мікалай Цудатворца" (1993), "Маленне аб Чашы" (1994), "Святы Вялікамучанік Георгій Перамоганосец"

[1]Згодна з аўтабіяграфіяй (Ф. 496, В. 1, Спр. 39) скончыў Рагачоўскую семінарыю

(1994), “Уваскрэсенне Хрыстова” (1995), “Святы Гасподні” (1996), “Уладзімірская ікона Божай Маці” (1996) і інш.

Аўтар артыкулаў пра рыбалку “На Волме” (1958), “Нахлыст” (1958), “На Беразіне” (1962), “Рыбацкие трофеи” (1966), “Снасть рыболова” (1966) і інш., якія друкаваліся ў часопісе “Сельское хозяйство Беларуси” і газеце “Мінская праўда”.

Яўген Назаравіч Ражкоў памёр 24 красавіка 2009 г. і пахаваны на гарадскіх могілках “Калодзішчы” ў Мінскім раёне.

Дакументы Яўгена Назаравіча Ражкова паступілі ў БДАМЛМ у два этапы ў студзені і сакавіку 2011 г. ад удавы Неанілы Мікалаеўны Ражковай. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 65 адзінак захоўвання (601 дакумент) за 1938–2011 гг.

Вопіс складаецца з 6 невялікіх раздзелаў, справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі.

Першы раздзел “Творчыя дакументы” (малюнкі і накіды) (1950–2000 гг.).

Другі раздзел “Фатаграфіі творчых работ Я.Н. Ражкова” (1946–2006 гг.).

Трэці раздзел “Перапіска Я.Н. Ражкова” (1956–2008 гг.).

Чацвёрты раздзел “Дакументы да біяграфіі Я.Н. Ражкова”. Сюды ўвайшлі асабістыя, службовыя, творчыя і юбілейныя дакументы (1944–2010 гг.).

Пяты раздзел “Дакументы пра Я.Н. Ражкова” (1960–2011 гг.).

Шосты раздзел “Выяўленчыя дакументы” (1938–2011 гг.).

У канцы вопісу змешчана справа з дакументамі Н.М. Ражковай (жонкі) за 2002–2010 гг.

Мастацкія работы Я.Н. Ражкова знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Дзяржаўным гісторыка-культурным музеі-запаведніку “Заслаўе”, Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі, Рагачоўскім музеі Народнай славы (акрамя творчых работ тут знаходзяцца і асабістыя дакументы мастака). Таксама работы знаходзяцца ў прыватных зборах у Беларусі, Расіі, Украіне, Літве, Латвіі, Германіі, Польшчы і ў інш. краінах.

Прадмову склала
вядучы архівіст Г.Б. Багамолава
19.01.2023

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА

ФОНД № 496
ВОПІС № 1
1938-2011

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 31.01.2023
№ 1

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 1 | Аўтапартрэт, партрэты маці і сына Я.Н. Ражкова. Малюнкі.<br>Папера, аловак | 1950-1952, 2000-2005 | 4 | 4 | |
| 2 | Малюнкі і накіды людзей для мастацкіх карцін "Мастакі на рыбалцы", "Рыбалка на возеры Сялява" і інш.<br>Чарцёж скрынкі для рыбы.<br>Папера, аловак | 1952-1956, 2002-2008 | 12 | 12 | |
| 3 | Карыкатуры.<br>Папера, туш | 1959 | 3 | 3 | |
| 4 | Малюнкі і эскізы афармлення выставак, інфармацыйных стэндаў і інш.<br>Папера, гуаш, каляровыя алоўкі, аловак, туш | [1950-я гг.] - 1961 | 7 | 7 | |
| 5 | Блакнот з вучэбнымі малюнкамі і накідамі Я.Н. Ражкова.<br>Папера, аловак | [1950-я - 1960-я гг.] | 18 | 1/15 | |
| 6 | Замалёўкі з выявамі Ісуса Хрыста, Божай Маці, Святога апостала і евангеліста Марка і інш.<br>Папера, аловак | [1990-я - пач. 2000-х гг.] | 7 | 8 | |
| 7 | Нацюрморт з астрамі, морквай і яблыкамі.<br>Папера, акварэль | 2000 | 1 | 1 | |
| | **2. ФАТАГРАФІІ ТВОРЧЫХ РАБОТ Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 8 | Фатаграфіі пейзажаў: "Ашэ", "Гагры", "Геленджык", "Даваенныя могілкі", "Зімняя раніца ў Мар'інай Горцы", "Перад навальніцай", "Поўдзень", "Рака Свіслач", "Старая хатка" і інш. (1946-1957) | | 25 | 25 | |
| 9 | Фатаграфіі пейзажаў: "Беларуская зіма", "Бярозкі", "Вярхоўе ракі Бярэзіна", "Залатая восень", "Мосцік", "Раніца", "Сакавік" і інш. (1957-1992) | | 25 | 25 | |
| 10 | Фатаграфіі пейзажаў: "Восень", "Зімні вечар", "Камень", "Мой родны кут", "Першая адліга", "Прыцемак", "Ціхі дзень" і інш. (1992-2001) | | 24 | 24 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 11 | Фатаграфіі сюжэтна-тэматычных карцін, малюнкаў, плаката: "Дэманстрацыя ў г. Мінску на дзень Перамогі", "Збожжа паспела", "Прыезд агранома ў калгас", "Рыбакі", "Рыбалка на возеры Сялява", "Сцяг перамогі над Рэйхстагам" і інш. (1947-1961) | | 14 | 14 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | Фатаграфіі партрэтаў : "Генерал І.П. Дуднік", "Мая матуля", "Наталія", "Сафія" і інш. (1949-2002) | | 16 | 16 | |
| 13 | Фатаграфіі аўтапартрэтаў (1995-1999) | | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | Фатаграфіі і ксеракопія ікон: "Архангел Гаўрыіл", "Святы Вялікамучанік і Цаліцель Панцеляіман", "Святы Вялікамучанік Георгій Перамоганосец", "Свяціцель Мікалай Цудатворца" і інш. (1989)-[пач. 2000-х гг.] | | 17 | 17 | |
| 15 | Фатаграфіі ікон: "Божая Маці Жыровіцкая", "Божая Маці Уладзімірская", "Гасподзь Уседзяржыцель", "Маленне аб Чашы", "Нерукатворны вобраз Збавіцеля на Убрусе", "Святая Троіца" і інш. (1993-1997) | | 21 | 21 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Фатаграфіі нацюрмортаў: "Валошкі", "Вялікдзень", "Яблыкі і каштаны" і інш. (1994-2006) | | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 17 | "Яўген Ражкоў. Іканапіс. Жывапіс". Каталог творчых работ мастака. З Благаславеннем Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта.<br>На лл. 2-3 - іконкі з выявамі Святога Праведнага Філарэта Міласцівага і Божай Маці Мінскай | 2002 | 24 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Дзённікавыя запісы Я.Н. Ражкова пра рыбалку. Чарнавы аўтограф.<br>Запісная кніжка Я.Н. Ражкова | 1954-1960 | 42 | 2 | |
| 19 | "На Беразіне", "На Волме", "Нахлыст", "Рыбацкие трофеи", "Снасть рыболова" і інш. Артыкулы пра рыбалку.<br>Чарнавы аўтограф, выразкі і ксеракопія з часопіса "Сельское хозяйство Белоруссии" | 1958-1978 | 13 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **3. ПЕРАПІСКА Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 20 | Пісьмы Я.Н. Ражкова да Н.Г. Ражковай (першай жонкі) і яе адказ на пісьмо | 1956-1974 | 28 | 15 | |
| | * * * | | | | |
| 21 | Пісьмо, віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы Я.Н. Ражкову ад сем'яў Гурскіх, Дуднік, Казакоў, Лісоўскіх і інш. | 1961-2001 | 34 | 24 | |
| 22 | Віншавальныя паштоўкі Я.Н. Ражкову ад Г.М. Сіроткі, А.І. Храпавіцкага, М.І. Якубава, Р.Г. Ястрэмскай і інш. | 1965-2008 | 35 | 25 | |
| 23 | Пісьмы і віншавальныя паштоўкі Я.Н. Ражкову ад мастакоў А.С. Гугеля, С.П, Каткова, [В.С. Пратасені], Я.М. Ціхановіча | 1966-2003 | 18 | 11 | |
| 24 | Віншавальныя паштоўкі Я.Н. Ражкову ад студэнтаў і школьнікаў з дзяржаўнымі святамі | 1976-2008 | 9 | 7 | |
| 25 | Пісьмо Я.Н. Ражкову ад пляменніцы Рыты і паштоўка ад стрыечнага брата Г.Р. Ражкова (г. Кіеў) | 1990, 2000 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Віншавальныя пісьмы і паштоўкі ад Савецкага і Фрунзенскага РК КПБ і РК ЛКСМБ г. Мінска, рэдакцыі часопіса "Сельское хозяйство Белоруссии", Рэспубліканскага аб'яднання "Белая Русь" і інш. Я.Н. Ражкову з дзяржаўнымі святамі | 1958-1980, 1983-2008 | 50 | 30 | |
| 27 | Віншавальныя паштоўкі ад Беларускага саюза мастакоў, Мінскага мастацка-вытворчага камбіната і інш. Я.Н. Ражкову з асабістымі і дзяржаўнымі святамі | 1975-2007 | 33 | 19 | |
| 28 | Пісьмы ад Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Реларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Я.Н. Ражкову аб немагчымасці фінансавання выдання каталога яго творчых работ і інш. | 2002, 2003 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 29 | Ксеракопіі дароўных надпісаў А.П. Астрэйкі, М.З. Башлакова, Т.М. Бондар, Н.С. Гілевіча, М.А. Савіцкага, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта і інш. Я.Н. Ражкову за 1961-2007 гг. | | 15 | 14 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **4. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 30 | Даведкі, пасведчанні, членскія білеты на імя Я.Н. Ражкова.<br>Арыгіналы і копія | 1944 [пач. 2000-х гг.] | 66 | 30 | |
| 31 | Натарыяльна завераная копія ордэра на права заняцця жылой плошчы, выдадзеная Я.Н. Ражкову. Пісьмо дырэктара Мінскага мастацка-вытворчага камбіната Н.М. Лабанава начальніку жыллёвага ўпраўлення Фрунзенскага райвыканкама Б. Кульганаву аб неабходнасці Я.Н. Ражкову выконваць мастацкія работы дома | 1948, 1978 | 2 | 2 | |
| 32 | Членскія кніжкі касы ўзаемадапамогі пры гаркаме мастакоў г. Мінска і пры мясцовым камітэце мастакоў саюза работнікаў мастацтва на імя Я.Н. Ражкова | 1950 | 5 | 2 | |
| 33 | Пасведчанні члена Мастацкага фонду БССР і Саюза мастакоў Беларусі на імя Я.Н. Ражкова | 1951-1998 | 9 | 3 | |
| 34 | Пасведчанні Міністэрства культуры БССР на права працаваць Я.Н. Ражкову над эцюдамі і замалёўкамі на месцах гістарычных падзей Вялікай Айчыннай вайны і інш. | 1956-1960 | 3 | 3 | |
| 35 | Запрашэнні СП БССР, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускага саюза мастакоў і інш. на юбілейныя вечары беларускіх пісьменнікаў П.У. Броўкі, У.С. Караткевіча і інш., на мастацкія выстаўкі і інш. на імя Я.Н. Ражкова | 1957-2004 | 25 | 13 | |
| 36 | Буклет санаторыя "Белоруссия" (г. Сочы), у якім адпачываў Я.Н. Ражкоў | 1972 | 12 | 1 | |
| 37 | Працоўныя дамовы СП БССР, Дома літаратараў і інш. з Я.Н. Ражковым на стварэнне партрэтаў пісьменнікаў У.С. Караткевіча, Я. Купалы, А.С. Пушкіна і інш.<br>На л. 2 - акт прыёма выканання работ з 1974 г. | 1974-1984 | 6 | 6 | |
| 38 | Віншаванні Мастацкага фонду БССР Я.Н. Ражкову з 70-годдзем Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, утварэннем БССР і Камуністычнай партыі Беларусі | 1987, 1988 | 2 | 2 | |
| 39 | Аўтабіяграфія Я.Н. Ражкова, запісаная яго жонкай Н.М. Ражковай.<br>Рукапіс | [пач. 1990-х гг.] | 1 | 1 | |
| 40 | Сшытак з віншаваннямі, пажаданнямі, водгукамі | 1997-2009 | 20 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | І.М. Лісоўскай, Ю.Д. Ляшчынскага, І.Н. Паражняка, А.М. Салаўёвай, М.А. Стралецкага і інш. для Я.Н. Ражкова | | | | |
| 41 | Буклет і інш. мастацкіх выставак "Вялікай перамогі ветэраны", "Памяць сэрца", "Панарама мастацтва" і інш. (з удзелам Я.Н. Ражкова) | 1998-2008 | 28 | 5 | |
| 42 | Запрашэнні Беларускага саюза мастакоў, Рэспубліканскай мастацкай галерэі і інш. на выстаўкі Я.Н. Ражкова | 2000, 2002 | 4 | 3 | |
| 43 | Пасведчанні Беларускага саюза мастакоў да медаля "За заслугі ў выяўленчым мастацтве" і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь да нагруднага знака "За ўклад у развіццё Беларусі" на імя Я.Н. Ражкова.<br>Ксеракопіі | 2000, 2003 | 2 | 2 | |
| 44 | Дакументы Я.Н. Ражкова для прысваення ганаровага звання "Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь" (выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў Беларускага саюза мастакоў, адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска, хадайніцтвы і інш.) | 2001-2005 | 14 | 12 | |
| 45 | Акты прыёма Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, Рагачоўскага музея Народнай славы і інш. на пастаяннае і часовае захаванне творчых работ і асабістых дакументаў Я.Н. Ражкова | 2001-2010 | 27 | 19 | |
| 46 | Пісьмо старшыні Беларускага саюза мастакоў В.С. Басалыгі Міністру культуры Рэспублікі Беларусь Л.П. Гуляку і дырэктару музея Вялікай Айчыннай вайны С.Н. Азаронку аб выдачы графічнай работы Я.Н. Ражкова "Знамя Победы над Рейхстагом" для экспазіцыі на выстаўку "60-летия Великой Победы над Германией" | 2005 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 47 | Віншавальныя паштоўкі Беларускага саюза мастакоў, Мінскага мастацка-вытворчага камбіната і інш. Я.Н. Ражкову з юбілеямі | 1980-2005 | 7 | 4 | |
| 48 | Сшытак з водгукамі наведвальнікаў выстаўкі Я.Н. Ражкова, прысвечанай 80-годдзю з дня яго нараджэння | 2000 | 11 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **5. ДАКУМЕНТЫ ПРА Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 49 | С.А. Ішчанка. "Тры старонкі "Сямейнага альбома", А.У. Ружачка. "Мастак, летапісец, чалавек", Л.[Ф.] Рыхцікава. "Горжусь своим правом..." і інш. Артыкулы пра Я.Н. Ражкова і з упамінаннем пра яго. Выразкі і ксеракопіі з друкаваных выданняў | 1960-1996, 2000-2010 | 11 | 11 | |
| 50 | "В годы войны меня спасла икона Евфросинии Полоцкой", "Нябесныя фарбы, або "мая лепшая ікона яшчэ не напісана...", "Я воевал целую вечность", "Я пішу жыццёвае" і інш. Інтэрв'ю Я.Н. Ражкова карэспандэнтам газет "Культура", "Літаратура і мастацтва", "Наша доля" і інш. Выразкі з газет | 1996-2004 | 8 | 8 | |
| 51 | Успаміны Н.М. Ражковай (жонкі), Н.Н. Кашчэй (Ражковай) (сястры), І.Н. Ражкова (брата) і інш. пра Я.Н. Ражкова | 1996, 2003-2011 | 37 | 10 | |
| 52 | Біяграфіі і біяграфічныя звесткі, радавод, спісы ўзнагарод Я.Н. Ражкова, складзеныя Н.М. Ражковай (жонкай). Аўтограф, машынапіс, ксеракопія аўтографа | [к. 1990-хгг.] - 2006 | 26 | 13 | |
| 53 | Словы памяці К.А. Маркіна, Г.М. Сіроткі аб Я.Н. Ражкове. Машынапіс. Паштоўка з вершам Г.М. Сіроткі "Памяти Евгения Назаровича". Аўтограф | 2009 | 9 | 3 | |
| 54 | Спісы творчых работ Я.Н. Ражкова і спіс выставак, дзе экспанаваліся яго карціны, складзеныя Н.М. Ражковай (жонкай) | 2011 | 9 | 6 | |
| | **6. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Н. РАЖКОВА** | | | | |
| 55 | Фатаграфіі Я.Н. Ражкова, індывідуальныя і з сябрам А. Сафонавым у г. Рагачове | 1938-1941 | 3 | 3 | |
| 56 | Фатаграфіі Я.Н. Ражкова, індывідуальныя | [1945]-2008 | 17 | 18 | |
| 57 | Фатаграфіі Я.Н. Ражкова з М.З. Ражковай (маці), Н.Г. Ражковай (першай жонкай), Д.Я. Ражковым (сынам), Н.М. Ражковай (другой жонкай) і інш. | [1950-я гг.] - 2008 | 9 | 9 | |
| 58 | Фатаграфіі родных Я.Н. Ражкова (маці Марыі Захараўны, сястры Надзеі Назараўны, унучкі Вольгі Аляксандраўны і інш.) | 1950-2006 | 9 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 59 | Фатаграфіі Я.Н. Ражкова з І.П. Дуднікам, А.А. Пігулеўскім, М.А. Стралецкім і інш. | [1950-я гг.] - 2006 | 12 | 12 | |
| 60 | Фатаграфіі Я.Н. Ражкова ў групах з мастакамі М.І. Валынцом, В.Г. Гаўрылавым, К.І. Завішам, Г.В. Лойкам і інш. | [1960-я гг.] - 2008 | 8 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 61 | Фатаграфія помніка Я.Н. Ражкова на могілках "Калодзішчы" у Мінскім раёне | 2011 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 62 | Фатаграфіі мастакоў Б.М. Аракчэева, А.М. Зінчука, М.А. Назарчука, Т.М. Паражняка, М.А. Савіцкага, У.П. Слінчанкі, старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В.І. Казлова, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта і інш. | [пач. 1960-х гг.] - 2008 | 10 | 10 | |
| 63 | Выявы пісьменнікаў П.У. Броўкі, Р.С. Бярозкіна, кампазітара Д.Д. Шастаковіча і інш. Фотакопіі і рэпрадукцыі | [1970-я - 1990-я гг.] | 8 | 7 | |
| 64 | Фатаграфія праекта макета плошчы Леніна з Домам урада ў г. Мінску (архітэктары праекта [Г.У. Заборскі і Л.П. Мацкевіч]) | [пач. 1950-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 65 | Дакументы Н.М. Ражковай (жонкі) (аўтабіяграфія, ксеракопія членскага білета Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Родители и учителя за возрождение православного образования", запрашэнні на мастацкія выстаўкі і інш.) | [к. 1970-х гг.], 2002-2010 | 19 | 13 | |

У дадзены вопіс унесена 65 (шэсцьдзесят пяць)

спраў з № 1 па № 65 , 601 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст Г.Б. Багамолава

2023

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.